Генадзь Бураўкін

ПЯШЧОТА

вершы
пра каханне

Мінск
Мастацкая літаратура
1985

* * *

Калі хто скажа,
што у каханні ён
Усё спазнаў і вычарпаў дазвання,—
Не верце.
Ён не знаў яшчэ кахання.
Ён яшчэ трапіць да яго ў палон,
І будзе плакаць над сабой былым,
І пракляне ўчарашняе бяссонне,
І здзівіцца,
што, можа, толькі сёння
Узнік кахання воблік перад ім.
Калі хто скажа,
што даўно
ані
Ужо няма ў каханні таямніцы,—
Не верце.
І яму яшчэ прысніцца
Яно, як цуд нязнанай чысціні,
І ён,
як невядомыя дары,
Адшукваць будзе для прызнання словы,
Каб спаконвечнае адкрыць нанова,
І тайну тайн шчасліва паўтарыць,
І зразумець аднойчы,
што жыццё
Было б пустым і вартмм спачування,
Калі б на свеце не было кахання,
Дзе ўсё спрадвек — сакрэт і адкрыццё…

* * *

Я ўсіх вас, закаханыя зямлі,
Назваць братамі роднымі гатовы,
Калі вы ў гэтым свеце бесталковым
Сустрэцца з нарачонымі змаглі.

Я падзяляю вашу весялосць,
Я разумею добра вашу ўдачу
І сам ад шчасця часам ледзь не плачу,
Бо і ў мяне цяпер каханне ёсць.

І я жыву ва ўладзе пекнаты,
Забыўшыся на скаргі і на страты…
І ўсё ж я перад вамі вінаваты.
Вы мне даруйце, родныя браты.

Я самую прыгожую з дзяўчат
Схаваў ад вас, забраў ад вас навекі.
Яе радзімкі, локаны і вейкі
Пяшчотна лашчыць толькі мой пагляд.

Адну яе стварыў натхнёны бог.
Другой такой ніхто ўжо больш не знойдзе.
Я абакраў вас, як нахабны злодзей.
Даруйце мне.
Іначай я не мог.

Я скарыстаў міг вашай слепаты.
Але і вы ўсе можаце, на шчасце,
Мяне падобным чынам абакрасці…
Дык будзем квіты, родныя браты.

НАПАМІН ХАЛАСЦЯКУ

Так спрадвеку павялося,
Што знайсці мы ўсё павінны
Свайго шчасця, свайго лёсу,
Свайго сэрца палавіну.

І пакуль ты адзінокі
Пасярод жыццёвай прозы,
Ты як быццам аднабокі,
Несалідны, несур'ёзны.

Хоць дасведчаны і знаны,
І жывеш на ўзроўні века,
Ты ўсё роўна
                    без каханай —
Палавіна чалавека.

Як людзей ні судзіш строга,
Ды без жончынага вока
Ты яшчэ сябе самога
Разумееш неглыбока.

Так што вер наіўным вершам
І навек адно запомні:
Толькі любую сустрэўшы,
Станеш ты нарэшце поўным.

Ды глядзі
                    (і так бывае) ,
Каб цябе не падлавіла
Дарагая, дзелавая,
Ды чужая палавіна…

* *

Вочы сінія-сінія…
Косы тугія…
Хтось шчаслівы, як кажуць,
дзяўчыну хрысціў.
Трэба вытаптаць многа дарог,
каб другія
Вочы гэткія, гэткія косы знайсці.
Пра такіх, пэўна, казкі складалі ў народзе,
Надзяляючы сотнямі светлых імён…
А цяпер —
гарманісты чародамі ходзяць,
Носяць песні-прызнанні ўначы ля акон.
А яна —
маладая ў сваёй прыгажосці.
Ні прызнанняў, ні песень не хоча яна.
Аднаго прычакаць бы ёй толькі у госці,
Ды з зямлёю яго абвянчала вайна…
Не згуляе вяселля той,
хто гэтак абвенчан.
А яна ўсё чакае, верыць казачным снам,
Адганяе сватоў, што прарочаць:
не вечна
Будзе доўгай каса, будзе яркай краса.
І даўно з хаты ў хату і з вуха у вуха
Носяць бабы па вёсцы няўмольны прысуд:
Застанецца яна назаўжды векавухай,
Нізавошта састарыць, загубіць красу…
Я не знаю,
быць можа, і праўда, не трэба
Ёй, прыгожай такой, адзінокаю жыць.
Я ж яе разумею…
І вельмі хацеў бы
Вось такое каханне ў жыцці заслужыць.

* * *

У прысадах цяністых
Я сустрэўся з табой,
Маёй светлаю, чыстай
Веснавою журбой,

Маёй ціхаю казкай,
Маёй першаю ласкай.

Тут мы часта хадзілі
Ля альтанак пустых,
Ціхім шэптам будзілі
Юных клёнаў лісты,

Новых сцежак шукалі,
Першых промняў гукалі.

А сягоння блукаю
Я адзін да святла
І прычыны не знаю,
Што з табой развяла,

Маім шчасцем пявучым,
Маім болем пякучым,

І усё, як калісьці,
У прысадах вясной:
Ліпкі ліпкае лісце
Параспраўілі зноў,

Клёны росамі ззяюць,
Птушкі сонца гукаюць,
Росам зоры варожаць,
Успамінам трывожаць
Маё сэрца.

ЗНОЎ ПАБАЧЫЎ ЦЯБЕ...

Цэлы тыдзень хадзіў я прыгнечаным,
Не гулялася, не спявалася.
Кожнай раніцай,
Кожным вечарам
Сэрцу нечага не ставала ўсё.

А сягоння
Зусім няпрошана,
Нечакана, неспадзявана я
Зноў убачыў цябе,
Харошая,
Дарагая,
Нецалаваная.

І гатоў салаўём заліцца я
На лады, на калены розныя,
Каб дзівілася нават міліцыя,
Што такімі бываюць цвярозыя.

І нясу, каханнем асвечаны,
Па вясновай зямлі сэрца гром-біццё.
Паглядзяць на мяне сустрэчныя —
І таксама шчаслівымі робяцца.

І магу я звярнуць нават гор хрыбты —
Сіла рвецца з грудзей нечуваная...
Ты ж пайшла.
І нічога не ведаеш ты,
Дарагая,
Нецалаваная...

* * *

Дай руку мне, любімая,
пойдзем
Проста па лужынах,
пад капяжы.
Аб узгоркі
ўзмакрэлы поўдзень
Точыць промні,
нібы нажы.

Вунь у снег наздраваты ўтыкае
Сонца
востры, бліщчасты нож —
І ад прьгаару
ў гурбы ўцякае
Палахлівы ручай басанож.

На іголъчатых вейках соснаў
Слёзы радасці —
пад карой
Прачынаюцца рэкі сокаў,
Закіпае зялёная кроў.

І прабілася ў дзюбе сініцы
Незнаёмая нота адна...
Дай руку.
Бачыш,
сонца ў зеніце.
І зусім недзе побач
вясна.

* * *

Не,
мы з табою не святошы.
Мы прагна выпілі,
да дна,
І ласку вечароў харошых,
І пацалункі да відна.

І мне
не раз яшчэ
салодка
Спаць на тугім тваім плячы
І,
як маланкаю, дрыготка
Аб вусны вусны апячы.

І раптам сцішыцца ў здзіўленні,
Калі няўмольна,
як прысуд,
Мяне зноў кіне на калені
Жаночай прыгажосці цуд.

Няхай яно жыве са мною,
Да скону грэючы жыццё,
Маё мужчынскае,
зямное,
Святое гэта пачуццё.

А калі скрываяцца святошы —
Ну што ж,
мы выпілі да дна
І ласку вечароў харошых,
І пацалункі да відна.

* * *

Другія
З доўгіх падарожжаў
Дамоў,
Да любых у двары,
Што найдзіўней,
Што найдарожай,
Вязуць заморскія дары.

А я
З далёкае дарогі
Табе на памяць прывязу
Падкову —
Месячык двухрогі —
І зорку —
Сінюю слязу.

І, не абмыўшы пот салёны,
На шчасце наша ці бяду,
Табе ў халодныя далоні
Свой лоб гарачы пакладу.

* * *

Сотні раздарожжаў паміж намі,
Прывакзальны тлум і шум травы.
Ды ўсё роўна над тваімі снамі
Я стаю — нязменны вартавы.

Месяцаву срэбраную сцежку
У руцэ трымаю, як прашчу.
Нават прынца казачнага ўсмешку
Да твайго акна не падпушчу.

А калі світанне ценем белым
Ляжа на прыціхлую ваду,
У расстанні доўгім асмялелы,
Да цябе нясмела падыду.

Адхіну ўспамінаў грэшных дымку,
Дзе схаваў я ад чужых людзей
Сонейка заспанае — радзімку —
У лагчынцы белай між грудзей…

СНЕЖНАЯ ІМПРЭСІЯ

Ты куды мяне клічаш,
          паслухай? —
На дварэ ні машын, ні людзей.
Завіруха мяце, завіруха…
Белы снег,
Белы цень,
Белы дзень.

Я іду за табой,
          як сляпая,
Патрапляю ў замецены след.
Засыпае нас снег, засыпае.
Белы снег,
Белы след,
Белы свет.

Як паходня,
          твой шаль ружавее.
І вакол —
          ні вачэй, ні акон.
На зямлі —
          я і ты
          і завея,
Белы снег,
Белы клён,
Белы сон…

* * *

Яшчэ доўга на ўсіх раздарожжах,
Між чужых, незнаёмых людзей
Буду я табе сэрца трывожыць
Успамінамі кожны дзень.

І калі пацалунак нейчы
Раптам губы твае апячэ,
Ты успомніш:
А той, ранейшы,
Цалаваў усё ж гарачэй.

І, быць можа, на тых раздарожжах
Зразумець ты паспееш яшчэ:
Ад мяне уцячы ты можаш,
Ад кахання ж —
Ніяк не ўцячэш.

* * *

Чуеш,
Наплывае цёплы гром?
Бачыш,
Зацвітае навальніца?
Не спяшайся ў свой зацішны дом
Ад сухога ветру зачыніцца.

Пачакай у садзе.
Не бяжы.
Хай знікае той,
Хто трэці лішні.
Не бяда,
Што летнія дажджы
Чохнуць з дрэў,
Як срэбраныя вішні.

Прытаіся на грудзях маіх.
І пад лопат вымытага лісця
Неба
Не зямлю,
А нас дваіх
Зыркаю маланкай перахрысціць.

* * *

Месяц — жоўтая лодка —
Плыве між аблокаў.
Пахне мятай
Салодка-салодка,
Далёка-далёка.

У абвялых пракосах
Дрэмле ціша святая.
Твае цёплыя косы
Я няўмелай рукой расплятаю.

І з рамонкамі белымі
Уплятаю ў іх сцежку вузкую,
І лаўлю ашалела
Гарачыя мілыя вусны.

І цалую
І шыю, і локці...
А ва ўсім вінаваты
Месяц — жоўтая лодка —
Ды салодкая мята.

* * *

Навек з табою нас жыццё звяло.
І мы ніколі між сабой не дзелім
Усё, што маем,—
І дабро,
І зло,
І цень трывогі,
І святло надзеі.

Што нам дзяліць найлепшае з дзівос,
Якое нават смерць забраць не ў стане? —
Зямное непаўторнае каханне
Адно на двух нам даў шчаслівы лёс.

Як раніцу з берасцяной трубы,
Яго мы п'ём —
І ўсё нам мала, мала.
Нам ні дзяльбы,
Ні здрады,
Ні кляцьбы
Яшчэ зязюля не накукавала.

І сняцца нам
Палянкі дзён сваіх
Адным неадцвітаючым надзелам.
І мы нічога на дваіх не дзелім.
Мы ўсё заўсёды
Множым на дваіх.

УСПАМІН ПРА НАЧЛЕГ

Лазім па арэшніку,
Бадзяемся па лесе,
Дзвіну на бераг цягнем у мокрых невадах.
А ў вачах —
Смугою —
Сіняе Палессе,
Нетаропкай Прыпяці бурая вада.
Асака высокая —
Зялёнымі штыкамі,
Забытымі шаломамі —
Пахучыя стагі.
І над зямлёю стомленай
Цішыня такая!
І месяц,
Як антонаўка,
Жоўты і тугі.

І жнівеньскія зоры,
Пахучыя,
Як дыні,
Сінія,
Нібыта верасы...
А ў чарнабровай нашай гаспадыні
Пахлі кменам рукі,
Мятай — валасы.
Нам яна выносіла кварту сырадою, Аржаны
акраец ламала напалам,
І частавала потым самагонкаю рудою,
І добрых сноў бязгрэшных на ноч
жадала нам.
І вось мы цэлы месяц бадзяемся па лесе,
Дзвіну на бераг цягнем у мокрых невадах,
А ў вачах —
Смугою —
Сіняе Палессе,
А на губах —
Тугою —
Далёкай мяты пах.

* * *

Каля твайго паркана снег мяце,
Парыпвае азяблая ігрушына.
А я шукаю след твой зацярушаны,
Блукаю ў несканчонай маяце.

Завея рве свае пухавікі,
Па твары б'е халоднай белай лапай.
Мне хоць бы лёгкі ўзмах тваёй рукі,
Хоць бы прамень з твіаёй настольнай
лямпы.
Мароз твае акно замураваў.
Паміж табой і мною —
Шкло настылае.
Ты каля печы грэеш рукі,
Мілая,
А я б дыханнем іх адаграваў... я б

* * *

Патухаюць, цямнеюць высі.
Зоркі ўспыхваюць над сінявой.
Да пляча майго прыхініся
Залатою сваёй галавой.

Чуеш вецер
І чуеш вечар?
Чуеш,
Ціха шапоча сад?
На твае худзенькія плечы
Асыпае ноч зарапад.

Гэта я табой вечарую,
Туманамі цябе чарую,
Васількоў шапатлівaю моваю
Зачароўваю,
Зачароўваю,
Роснай сцежкайю,
Рэчкай ціхаю
Закалыхваю,
Закалыхваю...

І ад рук няўмелых, нясмелых
Не схаваешся ты нідзе.
Поўня белая
Яблыкам спелым
На далоні твае ўпадзе.
Ты шапнеш мне адчайныя словы
Што шаптаў табе ўчора я ,
Вечаровоя,
Зачарованая,
Закалыханая
Мая.

* * *

Я не помню ўжо,
З якой прычыны
Лёс мяне закінуў незнарок
У той сад наднёманскі, шпачыны,
У далёкі, ціхі гарадок.

Не было ні песень, ні прызнанняў —
Толькі жоўты месяц між прысад,
Толькі зорнай хвалі калыханне,
Толькі сіні-сіні твой пагляд.

А мне ўсё яшчэ і зараз сніцца
Той далёкі,
Той вясновы сад,
Дзе,
Як недаспелыя брусніцы,
Ліхтары вячэрнія вісяць...

ЭЛЕГІЯ СТАРОГА САДУ

Я зноў прыйшоў у наш зарослы сад,
Дзе пахне зазімкам і лісцем прэлым.
Ён не такі,
Як дваццаць год назад.
Ён,
Як і я,
Здаецца пастарэлым.

Мне вусцішна між яблыняў ступаць,
Страсаць з галін абуджаныя згадкі.
І за спіной не веснічкі рыпяць,
А памяці разгойданыя кладкі...

I

У ціхім садзе нашага дзяцінства
Даўно сабе звіваюць гнёзды птушкі.
І я нячаста ў сад хаджу,
Каб раптам
Няўклюднага падлётка не спалохаць.

А можа быць,
Я больш за ўсё баюся,
Што ўспырхне,
Нібы жаўранак вясновы,
Забытае імя дзяўчынкі мілай
У белай блузцы і спаднічцы сіняй,
З чарнілам перапэцканымі пальцамі
І русаю худзенькаю касой?
Што, як яна жыве ў забытым садзе —
Абсыпаная рыжымі вяснушкамі,
Абстрыканая крапівой пякучай,
Цыбатая,
Нібыта бусляня?..
Чаго баюся —
Успамінаў смешных
Ці горкай і запозненай сустрэчы
З юначаю неразгаданай тайнай

І першым неўсвядомленым каханнем?
Ды не,
Якое там было каханне!
Было няўцямнае зямное шчасце,
Што вось жыве дзяўчо на белым свеце,
І лічыць мяне дужым і прыгожым,
І з захапленнем на мяне глядзіць.
І я пераканаць яе стараўся,
Што я папраўдзе нейкі незвычайны,
Што я прыгожы,
Дужы
І разумны,
А быў няўклюдны
І дурны як бот.
Я пасмяяўся з той дзяўчынкі мілай
Па-хлапчукоўску жорстка і бяздумна —
З яе вяснушак,
І з касы худзенькой,
І з нехаванай радасці ў вачах.
І я хадзіў, як певень, ганарысты,
Суровы,
Незалежны
І дасціпны,
І быў не варты нават шкадавання,
Не тое
Што яе няўцешных слёз...

Мы вельмі часта позна разумнеем...
Цяпер я ў сад заходжу асцярожна —
А што, як раптам хрусне пад нагою
Птушынае гняздо?..

II

Ты помніш сад,
Парэчкамі зарослы,
Дзе ля паркана быў куток таемны,
Куды ўцякалі мы з табой штовечар
Ад пільных матак і сяброў цікаўных?

Ты помніш?
Там нас хавала яблыня старая.
Мы слухалі маўчанне цёплай ночы,
І я нямеў,
Калі плячом гарачым
Ты прыпадала да майго пляча.
Там я аднойчы
Пры святле маланкі,
Як цуд, нікім не зведаны,
Убачыў
Твае блакітныя, як неба, вочы
І белыя, як яблыкі, калені.
На круглыя,
Як белыя налівы,
Клаў галаву я на твае калені
І піў каўшом Мядзведзіцы Вялікай
Тваё такое блізкае дыханне,
Наіўны і салодкі наш спалох.
І валасоў тваіх густая хмара
Мне засланяла і зямлю, і неба —
І гасла ўсё ў вачах,
І толькі вусны,
Твае сляпыя і сухія вусны,
Як месяц,
Прабіваліся праз цемру
І зноў вярталі мне ў душу святло...

Ты помніш?
Растуць парэчкі ў садзе,
Як калісьці.
А ля паркана —
Восеньскае лісце.
Сюды з табой штовечар мы ўцякалі
Ад пільных матак і сяброў цікаўных.
Тут пры святле маланкі я аднойчы
Зірнуў табе ў спалоханыя вочы...

Стаіць пад ветрам яблыня старая.
Ні павуцінкі
На галінах голых...

А я вачамі маладымі бачу
Два белыя налівы...

III

Быў позні і туманны адвячорак.
Сад звонка лапатаў пасля дажджу —
Як быццам тысяча срабрыстых гномікаў
Саскоквала з галінкі на галінку,
З ліста на ліст,
А з лісця
На траву.
Я ў сад пабег
Паслухаць гэты вэрхал,
Палюбавацца,
Як цяжкія кроплі
Ляцяць свінцовым шротам на пясок,
А яблыні абмытыя стаяць,
Нібыта маладзіцы пасля лазні.
Па лужынах і ручаях імчаў я.
У сэрцы калацілася гарэзнасць,
І мне хацелася такое крыкнуць,
Каб цэлы свет,
Уражаны,
Пачуў.
Тады арліным хлапчукоўскім вокам
Я ўгледзеў іх пад вымаклаю вішняй —
Яны застылі ў доўгім пацалунку,
Як у палёце спыненыя птушкі.
Яны мяне не бачылі, не чулі.
І я падкраўся —
І зарагатаў,
Спалохаў тое светлае імгненне,
Якое ўжо не зможа паўтарыцца.
Я загалёкаў:

«Цілі-цілі цеста!..»
Улёг за імі шчанюком звяглівым.
і ўсё чакаў,
Як голас мой падхопіць

І панясе пад гулкім небам рэха.
А сад маўчаў.
Маўчалі змрочна кроплі,
Што на лістах званочкамі віселі.
А яблыня старая
Поўнай жменяй
Дажджу мне сыпанула за каўнер.
І я замоўк.
Як быццам спатыкнуўся.
Мяне спыніў цяжкі дарослы сорам.
Пачуў я раптам,
Як замоўк чамусьці
У шапатлівых кронах звонкі лопат,
Як стала ў садзе золка і будзённа.

Я дзякую,
Што ты маўчыш,
Мой сад...

Мой сад...

* * *

Па той зямлі,
Дзе ўсё табою дыша,
Дзе твой каснік заблытаўся ў траве,
Плыве ў чаўне сярод туману ціша,
Мой сон пудлівы да цябе плыве.

З чужых краёў
Да вокан незабытых
Яго ўспамінам ціхім занясло.
Ляжыць вясло зламанае,
Нібыта
Сівавbooронкі шызае крыло.

І ходзіць над садамі сонны месяц,
І ў вокнах гаснуць познія агні...
Калі ты ўбачыш човен каля весніц,
Не адгані яго,
Не адгані...

ЮНАЦТВА СІНІЯ АРЭЛІ

Юлі

Яны прыглушана рыпелі
Сярод старых кашлатых ліп
Мы тыя сінія арэлі
Зламаць нікому не далі б.

Над імі гойдаліся далі,
Яны нам казкаю былі —
І ў неба сіняе ўзляталі,
І ледзь краналіся зямлі.

І як бы мы ні пастарэлі,
Няхай і летам, і зімой
Юнацтва сінія арэлі
Ляцяць між небам і зямлёй.

* * *

Каля бярозак беланогіх
Рабіны стройныя стаяць.
І стала торнаю дарогай
Сцяжынка вузкая мая.

І нашы клёны разрасліся,
І хуткаплынныя гады
Пазамялі апалым лісцем
Мае хлапечыя сляды.

За сіняватаю імжою
Ля нашай згубленай вярсты
Каханне новае, чужое
Збірае жоўтыя лісты.

А нам з табой упарта сніцца
Сцяжынка вузкая мая,
Бярозак юных завушніцы,
Рабін зялёная сям'я.

* * *

Табе, нібы прароку, веру,
Што пражывём шмат зім і лет.
І калі смерць мне грукне ў дзверы,
Я ператрушчу ёй хрыбет.

Ну, а калі не саўладаю,
Ты да мяне прыйдзі тады,
Прыгожая і маладая,
Як у юнацкія гады.

Падай мне рукі палахліва
І калі я ўсё ж упаду,
Дык у цябе,
Маёй цярплівай,
Маёй адзінай,
На віду.

НЕЗНАЁМКА

Яна ішла сцяжынкай вузкай
Да вечаровага сяла.
І ветразем
Над сіняй блузкай
Касынка белая плыла.

Ішла няспешна і стамлёна,
Спакой дзявочы несучы.
І шаўкавістай пасмай лёну
Каса ляжала на плячы.

І ў затуманеным прасторы
Ці то ў душы маёй
Плылі
Вачэй бяздонныя азёры,
Крылатых броваў жураўлі...

Ах, незнаёмка, незнаёмка,
Неспадзяваная бяда!
І прыпыніць цябе няёмка,
І адпусціць цябе шкада.

Калі яшчэ на сцежцы вузкай
Цябе сустрэну ля сяла?..
Як ветразь,
Над блакітнай блузкай
Касынка белая плыла...

* * *

Такі спрадвечны лёс мужчын:
Рвануцца з мілых рук,
Пайсці
І зноў перамагчы
Сто слот і завірух,
Заблытаць тысячу дарог
І выпіць дзесяць рэк,
І любай
Палажыць да ног
Увесь свой скарб і грэх.

Ну а калі
Праз сто разлук,
Праз сто смярцей вайны
Да мілых, незабытых рук
Не вернуцца яны,—
У тым няма віны мужчын,
Зусім няма віны,
Што рана леглі на спачын
Пад сосны і кляны...

* * *

Схаваўся месячык за дрэвы.
Міргаюць зоркі-спарышы.
Тваё акно салодка дрэмле
У цёплай жнівеньскай цішы.

Я сон твой палахлівы чую,
Да раніцы пaберагу
Тваю даверлівасць начную,
Тваю няясную тугу.

Не пабягу,
Як неба грымне,
За лесам рэха кракане
І грукнуць срэбраныя грыўні
Па незачыненым акне,
Як ломкае святло маланкі
На момант
Выхапіць з начы
Твае закрытыя фіранкі,
Каля паркана касачы.

Я сцерагчы ўсё роўна буду
Цябе,
Шчаслівую ад сну,
Сябе,
Цыбатага няўклюду,
І нашу першую вясну...

ЦІХІ ВЕРШ

Ціхая засень старэнькай альтанкі.
Ціхае шчасце —
Шэпат каханкі.

Ціхія гукі.
Цёплыя рукі.

Лісця чаромхі вячэрняя словедзь.
Вусны дыханне спалохана ловяць.

Сіняя ціша
Зоркі калыша.

Крылаў птушыных апошнія ўзмахі.
Святло патушылі шэрыя гмахі.

Чуеш,
Як б'ецца
Сэрца ля сэрца?..

* * *

Ты пазваніла мне з дзяцінства,
Далёкага,
Амаль забытага,—
І сэрца мне ўспамінам сціснула,
І сэрца спуджана забілася.

Няужо былое зноў вяртаецца
Няўжо навекі не памерлі
І клятвы даўнія,
І тайны,
І вернасць даўняя,
І вера?..

...У сэрцы
І ў мембране выстылай
Твой смех,
Як майскія грымоты...
Ты пазваніла мне з дзяцінства,
Далёкага
І незваротнага.

* * *

Сон мой сіні,
Салодкі верад —
У зацішку палян лясных
Зацвітае бахматы верас
Над цяжкімі слядамі ласіх.

Зацвітае.
І зноўку верыш:
Пад шырокімі лапамі хвой
Сцеражэ крэпканогую неруш
Баравік запаветны твой.

І бяжыць верасовай сцяжынкай,
Топча хмельны асенні мёд
Тая,
Лёгкая, як сняжынка,
Незабыўная,
Як крыгаход.

... Безнадзейнай, наіўнай верай
На далёкай юначай вярсце,
Сіні верас, бахматы верас
І сягоння яшчэ цвіце...

РАЗВІТАННЕ З ВЕРАНІКАЙ

Максіму Багдановічу

Ён нахіліўся над сталом
Пралескай позняю паніклай.
Самота стыне над чалом.
А вусны трызняць Веронікай.

Яна,
Як месяца святло,
Яму ўжо не сагрэе грудзі.
Такой,
Як сніў ён,
Не было.
Такой ніколі ўжо не будзе.

Пагасне месяц у акне,
А зоркі скоцяцца слязамі.
І смерць бязлітасна ўзмахне
Сваімі чорнымі крыламі.

Навек зламаецца вясло
На пеннай хвалі ў сіняй бухце.
Вачэй Максімавых святло
Трывожыць больш яе не будзе.

Што ж,
Паўглядаліся здалёк
І моўчкі разышліся жыцці...
А ўсё сінее васілёк
У спелым беларускім жыце...

* * *

Над лясамі самоты
Да цябе нацянькі
Паняслі самалёты
Мае аганькі.

Над зямлёю бяссоннай
На нябачным крыле
Колер шчасця —
Чырвоны —
Паплыў у імгле.

Над спакоем загонаў,
Над журбою людзей
Засвяціўся
Зялёны —
Весні колер надзей.

І з завоблачнай стыні
Апаў на лугі
Крыкам кнігаўкі
Сіні —
Ціхі колер тугі...

* *

I я не той,
                    і ты не тая,
Як у далёкія гады.
На вуснах набляднелых таюць
Вясны гарачыя сляды.
Ужо не здуць ніякім ветрам
Са скроняў тапаліны пух.
Агонь шаленства непрыкметна
Угаманіўся і патух.
I не вярнуць назад былога.
I не прайсці па той вярсце…
…А нашай памяці аблога
З ранейшай ярасцю цвіце…

СУСЕДКА

Калі раніцай вёдрамі ляскала
І да рэчкі спяшала босая,—
Я цябе цалаваў краскамі,
Я цябе цалаваў росамі.

Калі ў поўдзень ішла палеткамі,
Маладога спакою поўная,—
Я цябе цалаваў кветкамі,
Я цябе цалаваў промнямі.

Калі ўвечар да весніц выйшла
І стаяла пад вішнямі колкімі,—
Я цябе цалаваў цішаю,
Я цябе цалаваў зоркамі.

Што, як ноччу ў акно пагрукаю,
Недасяжная і спакусная?..
Я цябе цалаваў думкамі,
А хачу цалаваць вуснамі.

* * *

Не знаю ,
Гэта добра ці нядобра,
Ды што хаваць мінулыя грахі —
І мне таксам а міні даспадобы,
Хоць я ім запазніўся ў жаніхі.
Зноў прымушае здзіўлена спыніцца
Жаночы цуд,
Як гэты свет,
Стары .
У цесным калчане міні-спадніцы
Дзве юныя нагі —
Як дзве стралы.

І плёткі — міма.
Забабоны — міма.
І цокаюць
Па сонным сэрцы
Лодачкі.
І мілая дзяўчына ў моднай міні —
Як чарачк а крыштальная на сподачку.

І чырванеюць посныя персоны.
І адарваць вачэй не можа Бог
Ад лёгкага,
Як хмарка,
Парасону
Над грэшнай пара й загарэлых ног.
Пад пошласць — міны.
Пад святошасць — міны.
Аж крэкча цынік качкаю падсаднаю.
А стройныя дзяўчаты ў смелых міні —
Як строгія цюльпаны ў палісадніку.

І цёплы вецер ім каленкі мые.
І я без шкадавання і трывог
Гляджу,
Як небу адкрываюць міні
Зямную прыгажосць дзявочых ног.

* *

Не баюся,
што нехта табе аб каханні далдоніў,
Не баюся,
што нехта табе пра нявернасць плявузгнуў,
Не баюся,
што нехта
да ног тваіх скарб валачэ,—
Твае плечы
чакаюць маіх нецярплівых далоняў,
Твае вусны
чакаюць маіх перасмяглых вуснаў,
Твае вочы
чакаюць маіх пацямнелых вачэй.
Напляваць
на чужыя залёты і клятвы!
Напляваць
на чужую ману і пагрозу!
Напляваць
на чужыя спакусы і грошы!
Хто там глупства,
Што ты мне — не пара,
Чаўпе?..
Я з табою,
як вольная птушка, крылаты,
захмялелы ад шчасця, ад шчасця цвярозы.
Я з табою
багаты,
разумны,
харошы…
Дык няўжо ты дазволіш,
Каб стаў я нічым
Без цябе?..

* * *

…У прыцемку халодным прыскам тлеючы,
Твая сукенка ўпала каля ног,
І ты рукамі засланіла плечы,
Бо я ад іх святла аслепнуць мог.

Ты смеласці сваёй сама здзівілася.
А у мяне ў збянтэжаных вачах
Нібыта поўня белая дваілася.
І сэрца ашаломленае білася,
Як выпушчаны з цеснай клеткі птах.

Ты не ішла —
асыпаная зорамі,
Хмурынкай лёгкай да мяне плыла —
Уся з адчаю, чысціні і сораму,
З даверлівасці, страху і святла.

Цьмянелі,
Аддаляліся
і чэзнулі
Зямныя і нябесныя агні.
І я ступіў насустрач цёплай бездані
Здзіўлення,
шчасця,
тайны,
цішыні…

* * *

Шкадую жанчын,
                    што пасля пацалунку мужчыны
Не зведалі асалоды пацалунку дзіцяці,
Што навек ад сваіх грудзей адлучылі
Ненасытную, бессмяротную завязь жыцця.

Шкадую жанчын,
                    што пасля мужчынскіх абдымкаў
Не зведалі пяшчоты абдымкаў дзіцяці,
Калі каля вуха даверліва дыхае
Безабаронны працяг твайго зямнога быцця.

Шкадую жанчын,
                    што пасля ночы бяссоннай
На плячы сваім чулі
                    толькі холад няголеных шчок
І не песцілі цёплы і круглы, як сонца,
Плод кахання — няўцямны жывы камячок...

Аблысеюць паклоннікі.
Перамруць палюбоўнікі.
Супакоіцца ўрэшце шалу майскага каламуць.
І ці будзе каму
            ўспаміны аднолькавыя, як апалонікі,
Чыстай плоткаю ўскалыхнуць?..

ЭЦЮД РЭЎНАСЦІ

Нядаўна быў я чысты,
Як дзіця,
Не кранутае цвіллю недаверу,
І чалавеку верыў больш, чым зверу,
І кожны дзень чакаў я адкрыцця.

О Божа мой,
Як ты змяніла ўсё,
Як зруйнавала свет сваёю здрадай!
Цяпер я менш тваёй усмешцы рады,
Чым позірку прыручаных ласёў.

Цяпер я лепей птушкам занясу
Маю,
Табой адпітую,
Пяшчоту.
Хай п'юць з маёй далоні,
Як расу,
Ні кроплі не пакінуўшы на потым.

Нічога не чакаю я,
Ані.
Хай зерне шчасця склёўвае сініца...
Чаму дала ты права мне ўсумніцца
У вернасці людской і дабрыні?..

* * *

Ты чакай мяне доўга.
Ты чакай мяне мудра і проста.
Перасіль
                    і бяду,
                              і нуду,
                                        і жуду.
І даруй мне маўчанне,
Даруй мне халодную ростань
І не вер прадчуванню,
Што я да цябе не прыйду.
Прылячу хворай птушкай,
Прыпаўзу прыручаным зверам,
З сэрца выкіну злосць,
                                        і сумненне,
                                                            і сум
І цябе не абражу
Мужчынскім сваім недаверам.
Я цябе на далонях у свой ранішні сон
                                                  аднясу.
Зацалую цябе,
                    зашапчу,
                              залюляю,
Вочы ласкай наноўню,
Вусны прагай вясны запалю...
Ты чакай мяне толькі.
Ты чакай мяне.
Чуеш, малая?
Я таксама чакаю.
Таксама люблю.

* * *

Мне не забудзецца ніколі,
Як у азёрнай старане
Гуло сяброўскае застолле
І ты глядзела на мяне.

І сэнс, і тайна, і надзея
Былі ў бязладнай гамане,
Бо за сталом вясна сядзела
І ты глядзела на мяне.

Усё тады было дарэчы:
І драч, і юшка ў чыгуне.
І плыў туман над соннай рэчкай.
І ты глядзела на мяне…

Яшчэ не раз мне па-юнацку
Твой позірк знічкаю мільгне.
Хаця б на міг, хаця б знянацку
Зірні здалёку на мяне!

* * *

Не веру,
Што з гадамі адыходзіць,
Згасае палкасць маладых сустрэч.
Прыйдзі ка мне ў пакоры і лагодзе,
Маім рукам і вуснам не пярэч.

І не хавай,
Як хітрая цыганка,
Няўтольнага агню ў сваіх вачах.
Хай будзе тонкі месяц за фіранкай.
Хай будзе ціхі стогн каля пляча.

Хай згіне ўсё,
Што ўжо было,
Што будзе.
Але хай застануцца на вякі
Твае ненапалоханыя грудзі
І ля шчакі цяпло тваёй рукі...

* * *

Успамінай мяне хоць трошкі,
Як першае «ку-ку» ў бары,
Кахання высахлыя крошкі
У сховах памяці збяры.

І паднясі на міг да вуснаў,
Як памяць ветранай вясны, —
Хай не салодка, не спакусна,
А ўсё-ткі колюцца яны…

* * *

Вы чуеце —
Чаромха расцвіла?
Гайда ў лясы,
У веснавыя нетры!
Раз'ятраныя, халастыя ветры
Гуляюць ад сяла і да сяла.

Чаромхавая бель —
Як цёплы снег,
Як незаплямлены вясельны вэлюм...
І галава ўжо кружыцца завельмі,
І так салодка вабіць першы грэх...

Заві сваю адзіную,
Заві,
Бяжы да мілых вуснаў напярэймы,
Ламай чаромхі душныя бярэмы,
Кідай вясну да ног сваёй любві.

І шчасцем спапялі душу датла
Рашуча,
Безразважна
І чароўна...
Ах, што ты робіш,
Горкая чаромха!
Навошта гэтак рана расцвіла?..

* * *

Бег да цябе праз буран і імжу,
Поўз да цябе з летуценнем і скрухай.
Болей маўчаць не магу.
Я скажу.
Ты мяне ўважліва толькі паслухай.
Вуснамі смелыя словы ляплю,
Цяжка і горача іх выдыхаю:
Чуеш, каханая? — верна люблю,
Чуеш, любімая? — шчыра кахаю.
Можаш пасля адмахнуцца —
«Бывай»,
Можаш пасля адвярнуцца сурова.
Толькі даслухай, не перабівай.
Як мне баліць маё кожнае слова!
Вуснамі смяглыя вусны лаўлю
І перад вечнаю тайнай сціхаю...
Чуеш, каханая,— верна люблю,
Чуеш, любімая,— шчыра кахаю...

* * *

Паваражы,
Паваражы
На далані задубленай.
Што наварожыш,
Не кажы —
Я сам усё задумаю.

Паваражы,
Паваражы
На вуснах нецалованых.
Вузлом на памяць завяжы
Сцяжынку вечаровую.

Паваражы,
Паваражы
На чубе ускудлачаным
І на плячо мне палажы
Сваю руку гарачую.

Не захінайся,
Не бяжы,
Спыніся каля ганачка.
Паваражы,
Паваражы,
Бялявая цыганачка!..

* * *

Я за тваім плячом не разглядзеў
У доўгую хвіліну развітання,
Што за акном —
                    змярканне ці світанне,
Ці поўневая ноч, ці хмарны дзень.
Было адно імгненне на дваіх.
Было адно спякотнае дыханне
І вусны —
                    як кругі выратавання,
Калі ў бяссіллі мы шукалі іх.
Быў шэпт твой непрытомны:
«Дарагі…»
І неслухмяных рук перапляценне —
Як крылы птушак,
                    што не даляцелі
Да выраю
          і ўпалі на лугі.
І захлынуўся і спыніўся час,
І ты прынікла да мяне адчайна…
Я добра помню ўсё, што нас злучае.
І ўсё забыў, што разлучыла нас.

* * *

Любая,
          ты засланіла свет
Шэры, аднастайны і будзённы —
Электрычак цесныя вагоны,
Мокрыя, цяжкія парасоны,
Душны, непрыбраны кабінет,
Гуд аўтамабіляў манатонны
Быццам бы расталі неўпрыкмет.

Любая,
          ты расчыніла свет
Рознакаляровы і ўрачысты —
Раскідае срэбра дождж краплісты,
Сінява застыла ў шыбах чыстых,
Ловіць жвавых «зайчыкаў» паркет,
Электрычка кліча галасіста
На лясны прастор — за ёю ўслед.

Свет запаланілі перамены.
Матылёк успырхнуў на акне...
Гэта ты прыветна і праменна
Раніцой зірнула на мяне.

* * *

Зайздрошчу шчасцю юных закаханых,
Што так баяцца дотыку рукі,—
І ад яго грудзей адмежаваны
Яе грудзей тугія астраўкі.

Зайздрошчу іх святому аняменню,
Калі без слоў усё адчуць лягчэй,
І смешнаму, дзіцячаму няўменню
Хаваць пачуцці ад чужых вачэй.

Зайздрошчу іх наіўнаму спалоху,
Яшчэ незразумеламу агню,
Калі ўвесь свет змяняецца патроху
І дорыць азарэнне ўпершыню
І паміж кожным позіркам і словам,
Ужо зусім бяссільная,
                                        звініць
Напятая, як песня жаўрукова,
Зблізжэння недазволенага ніць...

* * *

Сябе да адзіноты прывучаю,
А шэпт твой горкі ўсё па сэрцы б'е,
Як жураўліны кліч,
Як крык адчаю:
«Я так засумавала без цябе!»
Навошта — зноў?
Усё даўно забыта,
Закрэслена маршчынкай на ілбе,
Я нашых сцежак болей не разблытваў —
Рассек
          і за сябе, і за цябе.
Ды толькі над разлівам іван-чаю,
Над палыном ссівелым
                              у журбе,
Як жураўліны кліч,
                              Як крык адчаю,
Плыве:
«Я так сумую без цябе!»

* * *

Атруці мяне
                  вясновым хмелем,
Апляці мяне
                  рукамі цёплымі.
На дваіх з табою мы падзелім
Ноч, што льецца залатымі кроплямі.

Ап’яні мяне
                  дыханнем чыстым,
Ахіні мяне
                  прызнаннем ціхім.
Мы ў далоні з неба зор маністы
Ссыплем рук суладным ускалыхам.

Прытулі мацней,
                  мая абранніца.
Наталі
         мае сухія вусны…
О, як хутка прыплывае раніца —
Сну і явы сонечнае вусце!..

* * *

Калі з начнога плёса
праз трысцё
Ты бегла
Да мяне на рукі ўпасці,
Я думаў,
Што каханне —
Гэта шчасце,
Якога хопіць мне на ўсё жыццё.

Калі ў расчаравання на мяжы
Мне вечнасцю здаваліся мінуты,
Каханне —
Думаў я тады —
Пакуты,
Якія немагчыма перажыць.

Калі ж суцішыў час мой гнеў пусты
І мудра ўраўнаважыў
сум і радасць,
Давер і рэўнасць,
жорсткасць і спагаднасць,
Я зразумеў:
Каханне —
Гэта ты.

* * *

Больш табе я не пазваню,
Не ўстрывожу самотную ростань.
Сам сабе канчаткова зманю,
Што зобыў цябе вельмі проста.

Ні вачэй тваіх,
Ні плячэй
Злым папрокам я не абражу.
Без цябе
Будзе несці лягчэй
Летуценняў наіўных паклажу.

Што паробіш,
Колі пагас
Пад дыханнем тваім халодным
Той агеньчык,
Што неколі нас
Нечакана апёк мімаходам.

Адбалела.
Прайшло.
Адплыло.
Не пакінула нават суму...
А быць можа,
І не было?
А быць можа,
Я ўсё прыдумаў?..

* * *

Мне з табой бы лепей размінуцца,
Міма праляцець на паўкрыла...
Дык чаму ж малюся той мінуце,
Што з табой няпрошана звяла?

Не было нічога,
Што б на свеце
Да цябе не падарыў мне лёс...
Дык чаму ж мне так таемна свецяць
Вочы твае,
Цёмныя ад слёз?

Мне з табой бы лепей развітацца
Кожная сустрэча —
Як турма...
Дык чаму ж твае слабыя пальцы
Я ў сваёй далоні затрымаў?

Размінуцца б лепей,
Размінуцца,
Каб душа спакойнаю была!..
А я ўсё малюся той мінуце,
Што з табой няпрошана звяла...

* * *

Скажы мне,
Скажы мне,
Што гэта было —
Адчаю імгненне,
У вечнасць імкненне,
Аб шчасці маленне,
Ці проста здзіўленне,
Ці проста
Зямнога кахання святло?

Скажы мне,
Скажы мне,
Што гэта было —
Ад гора збавенне,
Душы наталенне,
Прыход прасвятлення,
Ці проста збліжэнне,
Ці проста
Грудзей тваіх пудкіх цяпло?

Скажы мне,
Скажы мне,
Што гэта было —
Жыцця патуханне,
Ці смерці дыханне,
Ці неба ў абдымках зямлі
Калыханне,
Калі ні вяртання назад,
Ні адхлання,
А толькі
Рыдане,
Гарэнне,
Згаранне?..

Скажы мне,
Няўжо гэта з намі
Было?..

* * *

Я не сквапны — вы паверце.
Не прыслужваю рублю.
Лепшы яблык на талерцы,
Не шкадуючы, ўступлю.

Сувеніры, кветкі, рэчы
Нават тыя, што люблю,—
Забірайце. Не пярэчу.
Пашкадую — і ўступлю.

Сцежку лепшую ў прысадах,
Поля лепшага раллю
І высокую пасаду —
Не крыўдуючы, ўступлю.

А тваіх вачэй смяшынкі,
Як нябесны дар, каплю.
Ні адной тваёй маршчынкі
І слязінкі не ўступлю.

Праз пагрозы, насміханне —
Праз усё пераступлю.
А цябе, маё каханне,
Анікому не ўступлю.

* * *

Мільгаюць гады.
Я цяпер гэта ведаю добра —
Мільгаюць.
Не ўхопіш,
Не спыніш,
Назад не павернеш ніяк.
Пад ветрам
Бярозка
Дрыжыць сіратліва ля гаю.
Бярозка, а можа,
Забытая песня мая.
Плыве аблачынка
Па небе прасторным і сінім.
Мы ўслед ёй
Тужліва
З бярозкаю разам глядзім.
Не толькі гадоў —
Нават той аблачынкі
Не спынім
Ні песняй,
Ні просьбай,
Ні крыкам,
Ні шэптам сваім.
Сплыла аблачына.
Вясёлка палае над Пінай.
Глядзіцца ў Дзвіну
Сінявокая ніва ільну...
Быць можа,
Вось гэтак —
Бясследна,
Імкліва,
Няспынна —
З маімі гадамі
І я ля цябе прамільгну...

* * *

Ты спытала,
                    што вазьму я
У дарогу ў снег і слоту,
Калі вельмі засумую.
Адказаў:
— Тваю пяшчоту.

Ты пытала ў задуменні,
Што важней за ўсё —
Работа,
Шчасце,
Поспехі,
Натхненне?
Я шаптаў:
— Твая пяшчота.

Без падказкі і прымусу
У адчаі і самоце
Давяраю і малюся
Толькі ёй —
Тваёй пяшчоце.

І калі б ты запытала
У дзесяты раз і ў соты,
А чаго ў жыцці мне мала,
Я б сказаў:
— Тваёй пяшчоты…

* * *

Хай душа над былым не рыдае.
Плечы нам не прыгнулі гады.
Па-ранейшаму ты маладая.
Па-ранейшаму я малады.

Не бяда, што сняжок ападае
На юначыя нашы сляды.
Па-ранейшаму ты маладая.
Па-ранейшаму я малады.

І ніхто яшчэ не разгадае
Нашы хованкі, нашы брады.
Па-ранейшаму ты маладая.
Па-ранейшаму я малады.

Толькі сэрца вясну прыгадае —
І акрыюцца белым сады…
Па-ранейшаму ты — маладая?
Па-ранейшаму я — малады?..

* * *

Каму б я верыў,
Каб не ты?
Мне б дзень быў шэры,
Каб не ты.
І цуд дзявочай
Пекнаты
Не грэў бы вочы,
Каб не ты.

Пра што б я думаў,
Каб не ты?
Памёр бы з суму,
Каб не ты.
У свеце,
поўным
Нематы,
Я б стаў бязмоўным,
Каб не ты.

Няшчасны быў бы,
Каб не ты —
Без дабраты,
Без праваты.
І ўсё ў душы маёй дачасна
Даўно б пагасла,
Каб не ты...

ЗМЕСТ

* * * Ты чакай мяне доўга…
* * * Мне не забудзецца ніколі…
* * * Не веру…
* * * Успамінай мяне…
* * * Вы чуеце — чаромха расцвіла?..
* * * Бег да цябе…
* * * Паваражы…
* * * Я за тваім плячом не разглядзеу…
* * * Любая…
* * * Зайздрошчу шчасцю юных закаханых…
* * * Сябе да адзіноты прывучаю…
* * * Атруці мяне…
* * * Калі з начнога плёса…
* * * Больш табе я не пазваню…
* * * Мне з табой бы лепей размінуцца…
* * * Скажы мне…
* * * Я не сквапны…
* * * Мільгаюць гады…
* * * Ты спытала…
* * * Хай душа над былым не рыдае…
Каму б я верыў…

Бураўкін Г.

Пяшчота: Вершы пра каханне.— Мн.: Маст. літ., 1985. — 95 с., іл.

Новую кнігу вядомага беларускага паэта Генадзя Бураўкіна склалі вершы пра каханне.